# ЗАПРЫГОНЬВАННЕ СЯЛЯНСТВА Ў ВКЛ

*Андрэеў Д.Р.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Куракевіч Н.І. – канд. гіст навук, дацэнт*

Даследаванне прысвечана аналізу запрыгоньвання сялянства ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стагоддзях. У працы разглядаюцца прычыны, этапы і наступствы гэтага працэсу, а таксама яго ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы. Асаблівая ўвага надаецца юрыдычнаму афармленню прыгоннага права, катэгорыям сялян, їх становішча і ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. У параўнальным кантэксце вывучаецца становішча сялян у ВКЛ, Заходняй Еўропе і Маскоўскім царстве.

Працэс запрыгоньвання аказаў доўгатэрміновы ўплыў на сацыяльную і эканамічную структуру беларускіх зямель, што робіць важным яго вывучэнне для разумення гістарычных перадумоў сучасных сацыяльна-эканамічных рэалій.

Задачы даследвання:

даследаваць крыніцы і гістарыяграфічныя працы па дадзенай тэме;

ацаніць становішча сельскага насельніцтва у гэты час у ВКЛ;

пранаалізаваць развіццё ВКЛ ў параўнанні з іншымі краінамі таго часу.

Аб'ектам даследвання выступаюць прыгонныя сяляне. Прадмет даследвання — сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх сельскіх жыхароў.

Прааналізаваўшы пэўныя крыніцы, звязаныя з абранай тэмай, можна вылучыць некалькі прычын, што прывялі да гэтага працэсу. Яны падзяляюцца на эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя, згодна ўсім фактарам, якія паўплывалі на з'яўленне і станаўленне такой з'явы як запрыгоньванне сялянства.

Былі разгледжаны задакументаваныя абмежаванні правоў сялян:

Прывілей Казіміра (1447):

Абмежаваў свабоду перамяшчэння пахожых сялян.

Замацаваў сялян за зямлёй феадалаў, што стала пачаткам іх поўнай залежнасці.

Статут 1529 года:

Увёў паняцце «земскай даўнасці»: селянін, які пражыў на зямлі феадала больш за 10 гадоў, станавіўся прыгонным.

Замацаваў асноўныя правы феадалаў над сялянамі.

Статут 1566 года:

Павялічыў тэрмін вышуку ўцеклых сялян да 10 гадоў.

Узмацніў механізмы кантролю за сялянамі і іх перамяшчэннем.

Статут 1588 года:

Павялічыў тэрмін вышуку ўцеклых сялян да 20 гадоў.

Замацаваў юрыдычную залежнасць сялян ад феадалаў, што практычна ліквідавала магчымасць выхаду з прыгоннага становішча.

Валочная памера (1557):

Увяла адзіную зямельную меру — валоку (21,36 га).

Замацавала сялян за валокамі, што павысіла іх залежнасць ад феадалаў і зрабіла іх часткай таварнай гаспадаркі.

У выніку даследвання, было атрымана, што:

юрыдычнае замацаванне прыгоннага права ажыццяўлялася праз Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588),;

увядзенне валочнай памеры ўзмацніла эксплуатацыю сялян і спрыяла фарміраванню таварнай гаспадаркі;

параўнанне паказала, што ў ВКЛ сяляне мелі адносна лепшыя магчымасці для вызвалення, чым у Маскоўскім царстве, але горшыя, чым у Заходняй Еўропе;

***Спісак выкарыстаных крыніц:***

*1. Груша, А. І. Сацыяльная і эканамічная гісторыя Беларусі ў XIV–XVIII ст. / А. І. Груша. – Мінск: Беларусь, 2005. – 356 с.*

*2. Яноўскі, Ю. А. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага / Ю. А. Яноўскі. – Мінск: Выд. дом «Медысонт», 2010. – 280 с.*

*3. Ліхтаровіч, І. Г. Гісторыя сялянства Беларусі / І. Г. Ліхтаровіч. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 312 с.*

*4. Грыцкевіч, А. П. Беларуская дзяржаўнасць: ВКЛ і Рэч Паспалітая / А. П. Грыцкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 215 с.*

*5. Марцуль, І. М. Экономическая история Беларуси / І. М. Марцуль. – Мінск: БДУ, 2000. – 420 с.*